В настоящее время многие специалисты считают, что необходимо постепенно из процесса общения и лексикона врачей убрать такие понятия как «больной», заменив понятием пациент, ввиду того, что само понятие «больной» несет определенную психологическую нагрузку. Именно поэтому необходимо стараться заменять такого рода обращения к пациенту обращениями по имени иотчеству, тем более, что само имя для человека, его произношение, является психологически комфортным.

В современном мире врач – это социально значимая профессия, предполагающая постоянный рост своих профессиональных знаний и наличие большой ответственности.

Проблема коммуникации в медицинской сфере носит глобальный характер. Культура речи врача имеет большое значение в его профессиональной деятельности. Именно поэтому, на данный момент, всё ещё существует необходимость создания как коммуникативной, так и речевой культуры.

ЛИТЕРАТУРА:

1. Сущность и содержание понятия "коммуникативные навыки детей [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.newlypedagog.ru/nepjs-201-2.html. – Дата доступа: 10.10.2022.

2. Большая российская энциклопедии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bigenc.ru/philosophy/text/2675369. – Дата доступа: 10.10.2022.

3. Словарь практического психолога [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.otrok.ru/doktor/psy/txt/15/page1401.html. – Дата доступа: 10.10.2022.

# РОЛЯ ЖАНЧЫНЫ Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ СЯМ'І БЕЛАРУСАЎ У XIX – ПАЧ. XX СТАГОДДЗЯ

**Шымчук Е. І.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, Беларусь

Навуковы кіраўнік – к. г. н.Чарнякевіч І. С.

Трэба адзначыць, што ў разглядаемы перыяд становішча жанчыны ў сям'і беларусаў не было такім прыгнечаным, як у некаторых іншых народаў, у тым ліку і славянскіх. Напрыклад, у сербаў жанчыны цалавалі руку мужчыны, уставалі пры іх з'яўленні, прыслужвалі на бяседах, не маючы права прымаць у іх удзел. У чарнагорцаў жанчына не мела права прысутнічаць у мужчынскай кампаніі, а таксама хадзіць у царкву разам з мужам. Беларуская ж жанчына карысталася адноснай свабодай. Яна магла выказаць свае думкі, удзельнічаць у вырашэнні важных сямейных пытанняў, распараджацца пасагам па сваім разуменні. Аднак шляхі да грамадскай дзейнасці, развіцця здольнасцей, таленту былі для яе закрыты. І раней казалі, што «жанчыне дарога – ад печы да парога». Да жаночай эмансіпацыі негатыўна ставіліся і мужчыны, пазіцыю якіх

Репозиторий ГрГМУ

падтрымлівала грамадская думка [1, с.142]. Нераўнапраўе выяўлялася перш за ўсе ў неаднолькавых магчымасцях жанчыны ў параўнанні з мужчынам у прыняцці рашэнняў, у правах наследавання і інш., і разам з тым яна выконвала важную ролю гаспадыні дома, галоўнай выхавальніцы дзяцей, якіх яна апекавала да паўналецця [2, с. 179].

Народная традыцыя разглядала жанчыну-маці як асноўную выхавальніцу дзяцей, якая ажыццяўляла і галоўныя функцыі догляду за імі. Цесныя кантакты маці з дзецьмі з самага нараджэння стымулявалі і эмацыйна цёплы клімат адносін паміж імі [3,с.158]. Значная частка часу адводзілася абмену ведамі і ўменнямі жанчыны са сваімі дзецьмі, у першую чаргу, з дочкамі. Гэта і зразумела, бо навучанне было накіравана і на падрыхтоўку да будучага замужжа і, безумоўна, на фармаванне навыкаў выканання спраў, што традыцыйна адносіліся да жаночых. Найвялікшай вартасцю дзяўчыны лічылася працавітасць.

Разам з гэтым, вялікую ролю ў жыцці жанчыны, асабліва маладой, адыгрывала яе знешнасць. Як вядома, ідэал прыгажосці, які існаваў у кожным грамадстве, мяняўся ў часе. У XIX ст. ідэальнай лічылася прыгожая, «як ружа», дзяўчына з прыветлівым тварам, блакітнымі вачамі і вуснамі, «як каралі». Ян Баршчэўскі пісаў пра вясковую дзяўчыну: «пекная была дзяўчына: здаровая, румяная, як спелая ягада. Даўней як прыбярэцца і прыйдзе на кірмаш з жычкаю ў касе, у чырвонай шнуроўцы – свеціцца, як цвет макавы, усе не могуць на яе наглядзецца, кожны любіў з ёй патаньчыць, і дудар для яе граў ахвотней». Да таго ж яна павінна была быць дабрадзейнай, паслухмянай, цнатлівай, да працы ахвочай, вясёлай, добрай, шчырай сэрцам. У пачатку XX ст. модным лічыўся белы твар, а каб дасягнуць такога сялянскай дзяўчыне, якая мусіла працаваць на вольным паветры, твар закрывалі хусткай, пакідаючы вузкую шчыліну для вачэй.

Моладзь стараліся выхоўваць у пакоры, сціпласці і цноце. Павага, сарамлівасць, па словах А. Міцкевіча, адценьваюць цнатлівасць у маладых людзей [3, с.265].

Інтымныя адносіны ў сям'і характарызаваліся стрыманасцю. Нельга было выражаць свае пачуцці ў «моцнай, выразнай форме», асабліва калі прысутнічаў хто-небудзь чужы, а таксама пры дзецях. Асаблівасцю нацыянальнага характару беларусаў выступала боязь паказаць лепшыя рысы свайго характару. У сямейным жыцці гэта выяўлялася ў сарамлівасці мужа і жонкі выказаць адзін аднаму пяшчоту, добрыя парывы. Аб сваіх пачуццях гаварылі надзвычай рэдка [1, с. 143].

Важнай частка жыцця беларускай жанчыны было кіраўніцтва гаспадаркай. Напрыклад, у вясковай сям'і на Палессі нават у XIX ст. уладзе жанчыны-гаспадыні падлягала значная частка гаспадаркі, а таксама ўсе астатнія жанчыны і малодшыя дзеці, часам і гаспадар знаходзіўся пад яе ўплывам: "Ня гледзячы на грубіянства і імпульсіўнасць мужчын, часцей за ўсё, аднак, у хаце пануе жанчына <…> ад прыроды больш лёгкая на пад'ём і хітрэйшая, умее разпазнаць слабейшыя бакі свайго гаспадара і неўзабаве, з дапамогай адпаведных падыходаў ім кіруе. Часта з'яўляецца яму дарадчыцай у справах,

Репозиторий ГрГМУ

умее калі-нікалі навязаць сваю волю; і, хаця мужчыны заўсёды з пагардай адзываюцца аб бабскім розуме, тым не менш, часта бываюць пад поўным уплывам сваіх жонак” [4, с. 329].

Такім чынам, асноўнымі заняткамі жанчыны ў традыцыйнай сям’і заставалася выхаванне дзяцей і хатняя гаспадарка. Нягледзячы на паступовае павышэнне статуса жанчыны, яе роля ў грамадстве нават на пачатку XX стагоддзя ацэньвалася з перспектывы патрыярхальнай сістэмы каштоўнасцей і стэрэатыпаў.

ЛІТАРАТУРА:

1. Бандарчык, В. К. Сям’я і сямейны быт беларусаў/ В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Л. В. Ракава і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 256 с.
2. Ракава, Л. З гісторыі беларускай сям’і / Л. Ракава // Роднае слова, 1997. – № 6.– с. 172–181.
3. Ракава, Л. В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст. / Л. В. Ракава. – Мінск: Беларус.навука, 2009. – 311 с.
4. Jeleńska E. Wieś Komarowicze w pow. Mozyrskim. // Wisła, 1891, t. V. – S. 290–331

## ВООРУЖЕНИЕ ВОИНА ВОЛКОВЫССКОГО КНЯЖЕСТВА В XII-XIII ВЕКАХ

**Якубюк С. П.**

Гродненский государственный медицинский университет
Научный руководитель – к. ист. н., доцент Ситкевич С. А.

Волковыск – один из старейших городов Беларуси. Первое летописное упоминание относится к 1005 году [1]. На момент своего основания он представлял собой небольшое укрепленное поселение, впоследствии ставшее крепостью на славяно-балтском пограничье.

С течением времени поселение росло и развивалось, приблизительно с начала XII века оно вошло в состав созданного Гродненского княжества. А с 1142 года в Волковыске появился свой князь. Так было создано удельное Волковысское княжество, просуществовавшее примерно до конца 1250-х годов.

Весь период существования княжестваего территорию требовалось защищать от набегов ятвягов. Поэтому с момента основания Волковыска в нем присутствовал военный отряд. Во время нахождения города в составе Гродненского княжества гарнизон (военный отряд дружинников) подчинялсяназначенному князем воеводе. Впоследствии с появлением собственного князя этим вопросом стал заниматься он.

Дружина играла огромную роль в жизни Волковысского княжества. Точно о том, сколько дружинников входило в состав отряда князя судить сложно, ведь летописных данных нет, а вычислить количество воинов практически невозможно. Можно только приблизительно предположить о

Репозиторий ГрГМУ